ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дырэктар дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

_________ В.Л.Лакіза

“5” мая 2023 года

**ВОДЗЫЎ**

апаніруючай арганізацыі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» на дысертацыю Талмачовай Святланы Аляксандраўны «Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

1. ***Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны***

Дысертацыйнае даследаванне Талмачовай С. А. “Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)” адпавядае спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя і галіне навукі – гістарычныя, а таксама галіне даследавання – сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства на тэрыторыі Беларусі ў адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці, зацверджанага ВАК Рэспублікі Беларусь (загад № 180 ад 01.06.2022).

2. ***Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з адзнакай яго значнасці***

У беларускай гістарычнай навуцы праблема, па якой абараняецца дысертацыя, адносіцца да ліку не распрацаваных належным чынам. Асабісты ўклад саіскальніка ў яе распрацоўку з’яўляецца вельмі важным для перспектыўнага развіцця нацыянальнай гістарыяграфіі. Дысертацыя з’яўляецца самастойным комплексным даследаваннем. Паводле патрабаванняў метадалогіі гісторыіі, уклад саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы вызначаецца наступным: па-першае, паўнатой, разнастайнасцю і разнабаковасцю крыніцазнаўчай і гістарыяграфічнай базы; па-другое, наяўнасцю сістэмнага падыходу ў дасягненні пастаўленай мэты, па-трэцяе, атрыманымі вынікамі. Зыходзячы з адзначанага, неабходна канстатаваць, што дысертантам прааналізаваны вялікі масіў апублікаваных і неапублікаваных дакументаў, агульная колькасць якіх складае 875 пазіцый. Разнастайнасць і разнабаковасць

крыніцазнаўчай і гістарыяграфічнай базы дысертацыі пацверджана аналізам 80 заканадаўчых актаў, апрацоўкай звыш 300 адзінак неапублікаваных матэрыялаў з ахіваў Беларусі, Расіі і Літвы, большасць з якіх уведзена ў навуковы ўжытак упершыню.

Наяўнасць сістэмнага падыходу ў дасягненні пастаўленай мэты абгрунтавана і пацверджана тэарэтыка-метадалагічным адзінствам і непарушнасцю задач, аб'екта і прадмета, хcraналогіі і гістарычнай прасторы, палажэнняў, якія вынесены на абарону, інструментарыя метадалагічнага аналіза, структуры дысертацыі і яе вынікаў. Структура дысертацыі пабудавана і нацэлена на вырашэнне даследчыцкіх задач, складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў.

Вызначальным паказчыкам укладу саіскальніка ў рашэнне навуковай праблемы з'яўляюцца вынікі дысертацыйнага даследавання: 1) паспяховае рашэнне пастаўленных задач; 2) усебаковая абгрунтаванасць і доказнасць палажэнняў, якія вынесены на абарону; 3) распрацоўка новага навуковага кірунку айчыннай гістарыяграфіі, які грунтуецца на аўтарскай канцэпцыі гісторыі мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.

Трэба адзначыць, што распрацоўка саіскальнікам дадзенай навуковай праблемы дазволіць стварыць трывалую базу, неабходную для падрыхтоўкі новага акадэмічнага шматтомнага выдання па гісторыі Беларусі, што акрэслівае і ўзмацняе значнасць прадстаўленай да абароны дысертацыі.

***3. Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень доктара гістарычных навук***

Дысертацыйная работа С. А. Талмачовай уяўляе сабой першае ў беларускай гістарыяграфіі комплекснае даследаванне эвалюцыі функцыянальных абавязкаў і кірункаў дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі з 1861 па 1914 г., у якім упершыню высветлены перадумовы стварэння і вынікі дзейнасці спецыяльных органаў кіравання па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў, прычыны рэарганізацыі сістэмы мясцовых па сялянскіх справах устаноў паводле закону ад 27 чэрвеня 1874 г., вызначаны механізм узаемадзеяння землеўладкавальных камісій, губернскіх прысутнасцей, земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў у працэсе рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы і раскрыта ступень яе выніковасці на тэрыторыі Беларусі.

Зыходзячы з адзначанага і ў адпаведнасці з пп. 20-21 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў" Святлана Аляксандраўна Талмачова заслугоўвае прысваення ёй вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя за наступныя навуковыя вынікі:

– распрацоўку новага кірунку ў беларускай гістарыяграфіі, што знайшло

ўвасабленне ў выяўленні сутнасці і канцэптуальнага зместу аграрнай палітыкі расійскага ўрада, прасочванні тэндэнцый, адлюстраванні практычнай дзейнасці, асаблівасцей функцыянавання мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па яе рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі ў 1861–1914 гг.;

– вызначэнне этапаў ажыццяўлення аграрнай палітыкі расійскага ўрада: 1) люты 1861 г. – кастрычнік 1906 г., калі аб'ектам урадавай палітыкі выступала сялянская абшчына, на якую былі нацэлены асноўныя аграрныя мерапрыемствы; 2) лістапад 1906 г. – 1914 г., калі аб'ектам аграрнай палітыкі ўрада з'яўляўся селянін як прыватная юрыдычная асоба;

– раскрыццё перадумоў увядзення і механізму функцыянавання губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, адлюстраванне асаблівасцей фарміравання іх кадравага складу ў беларускіх губернях;

– высвятленне і характарыстыку адметнай сацыяльнай з'явы аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі – павятовых паверачных камісій, раскрыццё механізму фарміравання кадравага складу, вызначэнне іх ролі і месца ў абароне інтарэсаў мясцовага сялянства;

– ацэнку перадумоў стварэння і вынікаў дзейнасці спецыяльных органаў кіравання па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў – павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, раскрыццё ўрадавых падыходаў і адметных асаблівасцей правядзення чыншавай рэформы;

– адлюстраванне недахопаў і пралікаў у рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі, характарыстыку кірункаў і вынікаў дзейнасці інстытута земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў, выяўленне асаблівасцей фарміравання іх кадравага складу у беларускіх губернях;

– характарыстыку эвалюцыйных змен у складзе сацыяльнай структуры вясковага асяродку, якія адбываліся ў працэсе рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі, абгрунтаванне ролі і значэння штодзённай дзейнасці губернскіх прысутнасцей;

– прасочванне сацыяльных мэтаў і выяўленне адпаведнасці аграрнай палітыкі расійскага ўрада ў 1906–1914 гг. інтарэсам сялянства ў справе выхаду з абшчыны, перадачы зямлі ў прыватную уласнасць, стварэння хутарскіх і адрубных гаспадарак, перасялення ў Сібір і на Далёкі Ўсход.

### *4. Заўвагі па дысертацыі*

Разам з тым, дысертацыйнае даследаванне не пазбаўлена некаторых заўваг:

1. Падчас вызначэння колькаснага і саслоўнага складу кадравага патэнцыялу дзяржаўных па сялянскіх справах устаноў пры ўсёй складанасці і недахопе крытэрыяў, усё ж варта было б выявіць нацыянальны склад чыноўнікаў гэтых інстытуцый, асабліва пасля 1897 г.

2. Раскрываючы дзейнасць міравых пасрэднікаў, іх павятовых з'ездаў і губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, а таксама паверачных камісій, саіскальнік адзначае і ролю віленскіх генерал-губернатараў у працэсе рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. У той жа час уплыў генерал-губернатарскай і губернатарскай улады на дзейнасць спецыяльна створаных органаў дзяржаўнага

кіравання, пачынаючы з 70-х гг., практычна не прасочваецца. У сувязі з гэтым не зразумела, у чым прычына?

3. Верхняя храналагічная мяжа дысертацыі абмежавана пачаткам Першай сусветнай вайны, што не выклікае пярэчання. Разам з тым, у першым палажэнні, вынесенным на абарону, аўтарская храналогія (перыядызацыя) дзейнасці мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі – павятовых па чыншавых справах прысутнасцей, інстытута земскіх начальнікаў і іх з'ездаў, губернскіх прысутнасцей ахоплівае 1917 г. Таму ўзнікае пытанне крытэрыяў, якія былі пакладзены ў аснову вызначэння храналагічных межаў дзейнасці мясцовых дзяржаўных органаў па рэалізацыі ўрадавай аграрнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, значная частка якой ў 1917 г. была акупіравана Германіяй.

Неабходна, аднак, адзначыць, што выказаныя заўвагі маюць дыскусійны характар, яны не зніжаюць навуковай вартасці дысертацыі і не ўплываюць на палажэнні і вынікі даследавання.

### *5. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую яна прэтэндуе*

Праведзеная работа па самастойнаму збору эмпірычнага матэрыялу, глыбокім высокапрафесійным аналізе твораў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, вялікага пласту архіўнага матэрыялу, падрыхтоўцы тэкста дысертацыі, тэарэтычных палажэнняў, якія выносяцца на абарону, высноў дазваляе сцвярджаць, што навуковая кваліфікацыя саіскальніка адпавядае вучонай ступені доктара гістарычных навук, на якую ён прэтэндуе.

### *6. Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў*

Вынікі дысертацыйнага даследавання, яго палажэнні, высновы і факталагічны матэрыял могуць выкарыстоўвацца ў навукова-даследчай працы ў працэсе падрыхтоўкі новых выданняў па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі, пры падрыхтоўцы дыпломных і магістарскіх прац, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Інфармацыйныя звесткі, атрыманыя у працэсе даследавання, дысертацыйныя палажэнні, вывады маюць патэнцыял практычнага выкарыстання пры падрыхтоўцы абагульняючых навуковых работ, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў, спецкурсаў па гісторыі Беларусі і Расіі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Важна і тое, што матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваліся ў навучальным працэсе ва ўстановах адукацыі: "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка", "Гродненскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы" пры чытанні лекцыйных курсаў і спецкурсаў, правядзенні семінарскіх заняткаў па вучэбных дысцыплінах "Гісторыя Беларусі", "Гісторыя ўсходніх славян", "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах IX – XX стст.", "Мадэрнізацыйныя працэсы на тэрыторыі Беларусі (XIX – пачатак XX ст.)" для студэнтаў на першай і другой ступенях адукацыі, што пацверджана адпаведнымі "Актамі аб укараненні вынікаў" навуковай работы С. А. Талмачовай.

студэнтаў на першай і другой ступенях адукацыі, што пацверджана адпаведнымі "Актамі аб укараненні вынікаў" навуковай работы С. А. Талмачовай.

### *7. Заключэнне*

У адпаведнасці з загадам дырэктара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (№ 34-а ад 19 красавіка 2023 г.) водзыў падрыхтаваны экспертам – загадчыкам цэнтра гісторыі Беларусі канца XVIII – XXI стагодзя, доктарам гістарычных навук, дацэнтам Смяховічам Мікалаем Уладзіміравічам і абмеркаваны на пасяджэнні навуковага семінара дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" (пратакол № 1 ад 5 мая 2023 г.).

Саіскальнік С. А. Талмачова выступіла на пасяджэнні навуковага семінара з дакладам па дысертацыі, прыняла ўдзел у навуковай дыскусіі. На пасяджэнні навуковага семінара дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» прысутнічалі 6 чалавек, з іх дактароў гістарычных навук – 3, кандыдатаў гістарычных навук – 3. Па профілю дысертацыі (07.00.02 – айчынная гісторыя) і блізкіх спецыяльнасцей на пасяджэнні навуковага семінара прысутнічала 6 спецыялістаў. Вынікі адкрытага галасавання членаў навуковага семінара па дысертацыі С. А. Талмачовай: "за" – чалавек, "супраць" – , "устрымаўся" – .

**ПАСТАНАВІЛІ:** Зацвердзіць афіцыйны водгук на дысертацыю Талмачовай Святланы Аляксандраўны «Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі аграрнай палітыкі расійскага ўрада на тэрыторыі Беларусі (1861–1914 гг.)», прадстаўленую на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Старшыня навуковага семінара,
эксперт,
доктар гістарычных навук М. У. Смяховіч

Сакратар,
кандыдат гістарычных навук Н. Я. Новік

Смяховіча М. У.
Подпіс Новік Н. Я. сведчу
Вяд. спецыяліст па кадрах
"05" 05 2023 г.